# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС



2

1998

2(22) КРАСАВІК–МАЙ–ЧЭРВЕНЬ

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ
ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

**Выдаецца са студзеня 1993 г.**

**Выходзіць 1 раз у тры месяцы**

**З а с н а в а л ь н і к і:**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь,**
**Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі,**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт,**
**Беларускае таварыства "Веды"**

**Галоўны рэдактар Васіль Кушнер**

***Рэдакцыйная калегія:***

**Сымон Барыс** (рэдактар аддзела), **Пётр Брыгадзін**, **Яніна Важнік** (адказны сакратар), **Валерый Галубовіч**, **Пятро Драчоў** (мастацкі рэдактар), **Міхась Касцюк**, **Уладзімір Кошалеў**, **Аляксандр Міхальчанка**, **Алег Слука**, **Мікалай Сташкевіч**, **Клаўдзія Сякацкая**, **Алег Яноўскі**.

## ЗМЕСТ

**Мы не баімся праўды, мы аб'ектыўна вывучаем нашу гісторыю** *(інтэрв'ю галоўнага рэдактара В.Кушнера з дырэктарам Інстытута расійскай гісторыі РАН А.Сахаравым)* 3

З ГІСТОРЫІ ПАРТЫЙ І РУХАЎ

Сяргей СІМАНЮКОЎ — **Утварэнне РСДРП** *(да 100-годдзя правядзення I з'езда і 75-годдзя адкрыцця Дома-музея)* 13

П.Л.ТУЧАПСКИЙ — **Из пережитого. Девяностые годы** 21

Анатоль СІДАРЭВІЧ — **Самавызначэнне беларускай сацыял-дэмакратыі** 24

ДА 120-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БАЛГАРЫІ

Васіл ПЕТКАЎ — **З гісторыі Балгарскай дзяржавы** 33

Галіна СЯРГЕЕВА — **Беларусы ў барацьбе за свабоду Балгарыі** 42

Генадзь ШЭЙКІН — **Храм-помнік на Вайсковых могілках у Мінску** 47

Міхаіл ДАЎГЯЛА — **Беларуска-балгарскае супрацоўніцтва (1992–1997 гг.)** 50

ЭКАНАМІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Валерый КАЛЕСНІКАЎ — **Кіраванне прамысловасцю Беларусі ў 1918–1920 гг.** 53

Галіна ЕЛІЗАРАВА, Сяргей ЕЛІЗАРАЎ — **Эканамічнае раянiраванне і "беларускае пытанне" ў першай палове 1920-х гг.** 62

| | | |
|---|---|---|
| | ДЗЯРЖАВА I ПРАВА | |
| Адам КАЗЬМЕРЧЫК | **Гродзенскі сейм 1692–1693 гг. і яго вынікі** | 65 |
| | ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ | |
| Анатоль ШАРКОЎ, Уладзімір ПАЎЛАЎ | **Выкарыстанне працы ваеннапалонных і інтэрніраваных у аднаўленні народнай гаспадаркі Беларусі** | 71 |
| | З ГІСТОРЫІ АДУКАЦЫІ | |
| Наталля НОВІК | **З гісторыі прафесійнай адукацыі на Беларусі** *(другая палова XIX – пачатак XX стст.)* | 80 |
| | КРАЯЗНАЎСТВА | |
| Мікалай АНІСАВЕЦ | **Па слядах Міхайлы Крычаўскага і Януша Радзівіла** | 87 |
| Васіль ШАЙКОЎ | **Лёс Полацкага манетнага двара** | 93 |
| Віталь ЛУКІН | **Дзейнасць грамадскіх арганізацый у Латгаліі на пачатку XX ст.** | 98 |
| | МЕТОДЫКА. ВОПЫТ | |
| Вячаслаў ЛАЗІЦКІ | **Не адкрываю Амерыку...***(Адукацыйны праект на конкурсе прафесійнага майстэрства "Крыштальны журавель-97")* | 101 |
| | **Вывучэнне гісторыі ў 4-м класе** *(метадычныя рэкамендацыі ў сувязі з пераходам на 12-гадовы тэрмін навучання)* | 104 |
| Марыя ЖУК | **Слова пра настаўніка** | 110 |
| Яўген ХАМІЦЭВІЧ, Яніна ЮШКЕВІЧ | **Шлях да святыняў** *(X клас)* | 111 |
| Таццяна ВОЛКАВА | **Свет і Беларусь у першы перыяд новага часу** *(XI клас)* | 117 |
| | ЗАПРАШАЕМ ДА ДЫСКУСІІ | |
| Васіль ШАЙКОЎ | **Вучэбны план ВНУ трэба ўдасканаліць** | 124 |
| | НАВУКОВАЕ I ГРАМАДСКАЕ ЖЫЦЦЁ | 125 |
| | **Содержание** | 126 |
| | **Summary** | 127 |



Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6, пакой 30;
220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1.

Тэлефон: 222-35-81.

**ДП "Дом прэсы" Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку.**

Падпісана да друку
Афсетны друк.
Фармат 70x108$^{1}/_{16}$.
Ум. друк. арк. 11,2.
Умоўн. фарбаадбіткаў 14.
Ул.-выд. арк. 13,4.
Наклад 4 800 асобнікаў.
Зак. 937.

*Надрукавана з арыгінал-макета рэдакцыі ў друкарні выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, Мінск, пр. Ф.Скарыны, 79.*


**Да ведама аўтараў!**

**За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Найбольш значныя артыкулы рэцэнзуюцца. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш як 15 старонак, надрукаваныя праз два інтэрвалы ў двух экземплярах. Просім у допісах паведамляць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, дакладны адрас, тэлефон, кароткія звесткі пра сябе. Рукапісы не вяртаюцца.**

*УВАГА! Пераносы некаторых слоў, а таксама некаторыя абазначэнні на замежных мовах зроблены не па правілах граматыкі, а з улікам магчымасцей камп'ютэрнай настольна-выдавецкай сістэмы.*


**© "Беларускі гістарычны часопіс", 1998.**

Вячаслаў
ЛАЗІЦКІ

# Не адкрываю Амерыку...

*(Адукацыйны праект на конкурсе прафесійнага майстэрства "Крыштальны журавель-97")*

У кожнага пакалення свае ідэалы. Відаць, кожны з калег, які выкладае гісторыю ў школе, час ад часу ставіць перад сабой пытанні: "Наколькі цікавая маім вучням навука, з ведамі па якой я прыходжу ў клас? Ці з'яўляецца блізкім да дзіцячага сэрца мінулае нашага народа, які спрадвеку шукаў у гэтым свеце шчасце і лепшую долю пад сонцам?". Упэўнены, што ставяць іх перад сабою і маладыя настаўнікі, якія толькі што пачалі свой шлях на ніве адукацыі, і педагогі, якія маюць вопыт шматгадовай працы ў школе. Паміж настаўніцкімі пакаленнямі існуе дыстанцыя, якая розніць іх не толькі гадамі, але і глыбінёй асэнсавання праблематыкі сённяшняга часу, вастрынёй успрымання тых працэсаў, што праходзяць цяпер у беларускім грамадстве і ў рэфармуемай школе.

Настаўнікі, сацыёлагі, псіхолагі канстатуюць наяўнасць матывацыйнага крызісу ў галіне адукацыі. Паводле вынікаў сацыялагічных даследаванняў, сёння толькі 7—9% школьнікаў вучацца з зацікаўленасцю. Дваццаць гадоў таму гэты паказчык быў 20%. "Дзеці перабудовы" істотна пераарыентаваліся з духоўных на вузка прагматычныя інтарэсы. Яны мала вераць у ідэалы і нават агульначалавечыя каштоўнасці. Павялічылася колькасць падлеткаў, якія наогул не чытаюць кніг, арыентуюцца галоўным чынам на абстрактнае "сёння" і, зыходзячы з гэтага, на неадкладнае задавальненне сваіх патрэб. Падлеткі эпохі "першаснага назапашвання капіталу" ўжо выдатна асэнсавалі ролю выгодных сувязяў, карысных знаёмстваў і вялікіх грошай. Але, на вялікі жаль, яны яшчэ не ўсвядомілі, што дзеля таго, каб дасягнуць дабрабыту, неабходна нястомна працаваць, быць ініцыятыўнымі і прадпрымальнымі. Як жа сучасна гучаць сёння словы выдатнага расійскага гісторыка Васіля Ключэўскага: "У кожнага пакалення могуць быць свае ідэалы, у майго свае, у вашага іншыя, але

ЛАЗІЦКІ Вячаслаў Лявонцьевіч нарадзіўся ў г. Пінск Брэсцкай вобл. У 1989 г. скончыў гістарычны факультэт БДУ. Працуе ў пінскай СШ № 1. Мае вышэйшую катэгорыю. Лаўрэат конкурсу "Крыштальны журавель-97" у намінацыі "За выкарыстанне нетрадыцыйнай методыкі ў практыцы навучання айчыннай і сусветнай гісторыі, якая садзейнічае самасвядомасці беларусаў".




*Вячаслаў Лазіцкі абараняе свой адукацыйны праект на конкурсе "Крыштальны жураўель-97".*
**Фота Ю.Бондарава.**

шкада тое пакаленне, у якога няма ніякіх". Адсутнасць гістарычнай памяці з'явілася спрыяльнай глебай для шырокага распаўсюджвання нацыянальнага нігілізму (адрачэння ад роднай мовы, гістарычных звычаяў, традыцый, нормаў маралі, наогул нацыянальнай культуры). Узрошчваемые манкурты — відавочная пагроза існаванню самой нацыі.

Ці выхаваем мы патрыёта? Да якой мэты накіроўваецца карабель адукацыі сённяшніх дзён? Ці добра ведае каманда — ад капітана да боцмана і юнгі — арыенціры ў неабсяжнай адукацыйнай прасторы? Дзе і якая яна, гэтая кропка на карце — пункт прыбыцця, з якога ў самастойнае плаванне адправіцца вучань-выпускнік? Пытанні-метафары... На караблі адукацыі ў гэты час ідзе пераасnастка, і я пытаюся ў сябе: дзе маё месца на ім? Каля штурвала ці каля ветразя? Паспрабую ж угледзецца ў далечыню і падзяліцца сваім бачаннем і думкамі наконт ролі, якую павінны адыгрываць гістарычная адукацыя, урок гісторыі, настаўнік і вучань у будучым стагоддзі.

Сацыяльны заказ грамадства школе XXI стагоддзя будзе вызначацца тымі задачамі, якія павінна вырашаць яго кожная састаўная адзінка. Гэта, безумоўна, адукаваная, творчая, гарманічна развітая асоба, здольная свядома і адказна рэагаваць на хуткія змены ў гэтым свеце. Характарыстыка чалавека будучага як "чалавека разумнага" (homo sapiens) крайне недастатковая. На мой погляд, вучань, што пакіне сцены школы ў наступным стагоддзі — гэта

— чалавек гуманны і высокамаральны (homo moralis), які арыентуецца на маральныя каштоўнасці сусветнай цывілізацыі;

— чалавек з высокай грамадзянскай пазіцыяй (homo patris), сапраўдны патрыёт сваёй Радзімы, які дакладна ўсведамляе сваю ролю ў сістэме грамадскіх адносін, месца ў грамадстве ў цэлым;

— чалавек інтэлектуальны (homo intelectus), які імкнецца да вяршынь пазнання, валодае ягонымі прыёмамі, мысліць творча, неардынарна;

— чалавек, які валодае высокай экалагічнай культурай (homo ecolohis), усведамляе сябе часткай сусветнага грамадства, вядзе здаровы лад жыцця.

Гэта яны, вучні будучага, III тысячагоддзя, ужо сёння нічога не прымаюць на веру. Яны будуць жыць, ствараць нешта новае па сваіх праектах. Яны, абуджаныя праўдай, заўсёды ў пошуку, і, спадзяюся, што мары свае здзейсняць. І гэта ім давядзецца вырашаць задачы далейшага развіцця грамадства будучыні, праяўляць смеласць, браць грамадзянскую адказнасць на сябе.

Гістарычная адукацыя і ў XXI стагоддзі будзе заклікана не толькі вучыць школьніка думаць, аналізаваць, супастаўляць лічбы, факты, але і, грунтуючыся на вопыце

мінулых пакаленняў, растлумачыць сучаснасць, прадбачыць і прагназаваць будучыню. Гісторыя ў цеснай сувязі з іншымі школьнымі прадметамі (дысцыплінамі) і навукай будзе напрамкі садзейнічаць цэласнаму ўспрыманню навакольнага свету і асэнсаванню месца чалавека ў ім.

Ёсць тры галіны, вывучэнне якіх незвычайна ўзбагачае і развівае мысленне — гэта галіна моў (і ўсё, што з імі звязана — гісторыя, культура, літаратура), галіна прыродазнаўчых навук і матэматычны аналіз. Фарміраванню актыўнай і творчай асобы вучня будуць садзейнічаць як змест гістарычнай адукацыі, так і прынцыпы і метады навучання.

Калі настаўніка будзе задавальняць простае рэпрадуцыраванне ведаў, дык гэта прадугледжвае шэраг пасіўных дзеянняў у дыялогу ("звязцы") "настаўнік — вучань" і ён стварае прыкладна такую схему дзеянняў на ўроку:

— перадача настаўнікам тэматычнай інфармацыі;

— запамінанне атрымліваемай інфармацыі вучнямі;

— аднаўленне атрыманай інфармацыі з дапамогай падручніка дома;

— кантроль за якасцю засваення інфармацыйнага аб'ёму.

Аднак такі спрошчаны шлях з'яўляецца шляхам малапрадуктыўным з-за нізкага ўзроўню самастойнасці ў працэсе навучання ва ўмовах вялікага па памерах курса са складаным паняційным апаратам. Навукай адзначана, што ўрок сучасны (як і ўрок будучыні) будзе паспяховым, калі на ім настаўнік здолее спачатку захапіць вучняў сваёй навукай, а потым пастаянна падтрымліваць, развіваць у іх цікавасць да навучання, што стане нормай яго заняткаў у школе. Менавіта з такой сітуацыяй звязаны псіхалагічны феномен рэмінісцэнцыі — з'явы, пры якой аднаўленне раней вывучанага матэрыялу не толькі не пагаршаецца, але наадварот — паляпшаецца. Рэмінісцэнцыя найбольш яскрава праяўляецца на матэрыяле, што выклікае цікавасць. Я не адкрыю Амерыку, сцвярджаючы, што светам кіруе зацікаўленасць і што менавіта яна накіроўвае апантаных на штурм вышынь ведаў. І менавіта эмацыянальнасць на ўзроўні суперажывання, а таксама і абуджэнне цікавасці да навучання, сёння і ў будучым будуць арыенцірамі ў стварэнні творчага і незабыўнага ўрока гісторыі. Мой урок будучыні — гэта ўрок, дзе ўсё кранае сэрца і душу, абуджае розум, дзе знікаюць часавыя і прасторавыя межы і пануе тое, што называю простым словам "прыналежнасць". Прыналежнасць да мінулага свайго народа, да ягонай гістарычнай памяці і да лёсу яго будучыні таксама.

У XXI стагоддзі роля настаўніка як суб'екта навучальнага працэсу будзе несуразмерна важнай. Ён будзе ўмела спалучаць майстэрства і прафесіяналізм, уменне арганізаваць дыдактычныя працэсы з вызначэннем матывацыйных элементаў (знешніх і ўнутраных). Настаўнік гісторыі — гэта не толькі і не столькі гісторык-энцыклапедыст, які ведае адказы на пытанні "што?", "дзе?", "калі?", "чаму?" і "ў якой паслядоўнасці?". Яго мэта — фарміраванне і развіццё асобы, выкарыстоўваючы пры гэтым актыўныя метады навучання, асобасна-арыентаваныя на якасныя змяненні вучня (ідэі Л.Выгоцкага, А.Лявонцьева). Педагог і ў XXI стагоддзі будзе працаваць па формуле К.Ушынскага і А.Дыстэрвега: толькі асоба выхавае асобу.

Нагадаю пра адзін выпадак з не такой і даўняй сусветнай гісторыі. На пачатку 60-х гадоў кангрэс Злучаных Штатаў Амерыкі, які быў занепакоены поспехамі СССР у засваенні касмічнай прасторы, па асабістым распараджэнні прэзідэнта Джона Кенэдзі стварыў камісію па вывучэнні прычын адставання ЗША ў космасе. Адна з высноў, да якой прыйшлі кангрэсмены, была наступная — галоўная крыніца дасягненняў Саветаў знаходзіцца ў стане і развіцці адукацыі. Выходзячы з гэтага, амерыканцы пачалі рэфармаванне сваёй адукацыйнай сістэмы, што і здолелі зрабіць даволі паспяхова. Магчыма, праводзіць гістарычныя паралелі справа няўдзячная, але тое, што сёння мы па нейкіх пазіцыях у свеце тэхналогій знаходзімся ў стане даганяючых, факт неаспрэчны. Беларуская школа на шляху рэфармавання — гэта наша надзея на ўсё лепшае ў будучыні.

У 2008 годзе мая малодшая дачка будзе вучаніцай выпускнога класа. Якімі вачамі будзе глядзець яна на навакольны свет? Якой будзе школа будучыні? Гэта залежыць і ад мяне... Таму і сёння і цераз 10 гадоў зайду ў клас і на школьнай дошцы зноў напішу "HISTORIA EST MAGISTRA VITAE". І на кожным уроку даказваю і буду даказваць вядомую ісціну, якую некалі сказаў вялікі Цыцэрон: "Гісторыя — настаўніца жыцця".